Канфлікты існуюць у любым грамадстве. Таму іх варта вывучаць і знаходзіць прымальныя метады вырашэння. Найбольш плённы варыянт – метад палітычнага ўрэгулявання, які патрабуе знаходзіць неабходныя механізмы для выніковых перамоў, кансультацый, шукаць альтэрнатыву для ўзаемапрымальных рашэнняў. Удзельнікі перамоў павінны строга захоўваць дамоўленасці, што не будуць ствараць сітуацыю супрацьстаяння розных галін улады паміж карэнным і некарэнным насельніцтвам, палітычнымі элітамі варожых бакоў.

Пазбегнуць канфліктаў немагчыма. Таму важна знаходзіць такія механізмы ўзаемаадносін, якія ў стане дапамагчы вырашыць, абыйсці абвастрэнні, што ўзнікаюць паміж суб'ектамі палітычных адносін.

Адным з важных спосабаў вырашэння канфліктаў з'яўляецца кансэнсус (лац. *consensus* – згода, адзінства), які патрабуе наяўнасці паміж канфліктуючымі бакамі некаторых базісных норм, каштоўнасцей, пазіцый, арыентацый, прымальных для абодвух бакоў. Кансэнсус патрабуе перш за ўсё ўсеагульнай згоды на пытанню прыняцця рашэнняў. Пры дасягненні згоды меншасць павінна падпарадкавацца рашэнням большасці, якая перамагла ў адкрытым палітычным саперніцтве. У той жа час, гэта большасць павінна забяспечыць правы меншасці на пратэст, крытыку, апазіцыю. Дасягненне кансэнсусу выключае прымяненне сілы, сілавога націску. Кансэнсус патрабуе высокага прафесіяналізму, цярпімасці, майстэрства палітыкаў. Вялікую ролю ў дасягненні прымірэння інтарэсаў адыгрываюць палітычныя інстытуты і партыі, заканадаўчыя органы, пасрэдніцкія арганізацыі, а таксама рэлігійныя дзеячы.

Без згоды асноўных сацыяльных сіл, палітычных лідэраў (фармальных, нефармальных) немагчыма выйсці з эканамічнага крызісу, нацыянальнай канфрантацыі, адрадзіць маральнасць, дабіцца сацыяльнай стабільнасці, пабудаваць грамадзянскую супольнасць.

## 2.2. Палітычная ўлада

Аснову зместу палітыкі складае праблема ўлады. Таму паняцце "улада" займае адно з цэнтральных, асноватворных месцаў сучаснай палітalогіі. Яно дае ключ да разумення ўсяго палітычнага жыцця грамадства, усіх палітычных працэсаў і з'яў, якія адбываюцца ў ім. Менавіта ўладай вызначаюцца межы тэрыторыі дзяржавы, рэалізацыя агульных інтарэсаў. Разгледзім наступныя пытанні:

1. Палітычная ўлада: змест і сутнасць.
2. Структура і функцыі палітычнай улады.
3. Легітымнасць улады.

① Улада з'явілася з узнікненнем чалавечага грамадства. Да ўзнікнення класаў і дзяржавы ўлада насіла грамадскі характар: не было апарату, які стаяў над грамадствам, асобных прымусовых установаў.

У першабытным радавым грамадстве ўлада ажыццяўлялася ўсімі членамі роду (племені), якія выбіралі старэйшыну. Са з'яўленнем класаў і дзяржавы кроўныя радавыя сувязі былі парушаны, а замест маральнага аўтарытэту старэйшыны роду ўзнік аўтарытэт публічнай улады, якая аддзялілася ад грамадства і стала над ім.

Палітычная думка старажытных народаў узыходзіць да міфалагічных вытокаў, уяўленняў, згодна якім зямныя парадкі складаюць непарыўную частку агульнасусветных, касмічных парадкаў, што маюць боскае паходжанне, г. зн. на зямлі ўлада ад Бога.

Найбольш значным укладам у вучэнне аб уладзе з'явіліся славутыя законы XII табліц (451—449 гг. да н. э.), працы Ціберыя Лукрэцыя Кара (99—55 гг. да н. э.), асабліва яго паэма "Аб прыродзе рэчаў", вучэнне Цыцэрона аб дзяржаве і праве і інш.

Важна, што Цыцэрон аналізуе розныя формы дзяржаўнай будовы. У залежнасці ад ліку людзей, якія правяць, ён падзяляе іх на тры простыя формы кіравання: царскую ўладу, аптыматаў (арыстакратыю) і народную ўладу (дэмакратыю). Цікава, што Цыцэрон выступаў за змешаную форму кіравання. На яго думку, простыя формы ўлады не з'яўляюцца дабрабытам для грамадства, у сілу сваёй аднабаковасці і няўстойлівасці яны знаходзяцца на "абрывістым і слізкім шляху", які вядзе да няшчасця. Цыцэрон лічыў, што змешаная форма ўлады цалкам можа быць ажыццёўленая.

Першы праект раздзялення адзінай улады на некалькі незалежных, але ўзаемазвязаных улад, якія маглі супрацоўнічаць і кантраляваць адна другую, належыў Дж. Локу (сярэдзіна XVII ст.). На яго думку, трэба падзяліць уладу па заканадаўчую, выканаўчую (яна ж і судовая) і федэратыўную, якая б ведала міжнароднымі адносінамі.

Вялікую ролю ў вучэнні аб уладзе адыграў Ш. Мантэск'е. У XVIII ст. ён стварыў тэорыю раздзялення ўлад у яе сучасным выглядзе: на заканадаўчую (парламент, мясцовыя органы самакіравання), выканаўчую (урад і яго ўстановы, выканаўчыя органы на месцах — прэфектуры і г. д.) і судовую (канстытуцыйны і вярхоўны суды, судовая сістэма, органы нагляду і г. д.).

Праблемы ўлады знаходзяцца ў цэнтры ўвагі сучаснай заходняй паліталогіі. Істотны ўклад у распрацоўку тэорыі ўлады ўнеслі В. Парэта, Г. Моска, Р. Міхельс. Асабліва вялікая роля належыць М. Вэберу, які разумеў пад уладай любую магчымасць праводзіць унутры дадзеных

сацыяльных адносін уласную волю нават насуперак супраціўленню, незалежна ад таго, на чым такая магчымасць заснавана.

Вядомы амерыканскі палітолаг Т. Парсанс сцвярджаў: "Улада... займае ў аналізе палітычных сістэм месца, якое ў многіх адносінах падобнае таму, што займаюць грошы ў эканамічных сістэмах". У духу такога падыходу Г. Ласуэл і А. Каплан характарызавалі палітычную навуку як дысцыпліну, якая даследуе фарміраванне і размеркаванне ўлады.

Што ж такое ўлада? У чым яе сутнасць?

Улада ёсць уласцівыя грамадству валявыя адносіны паміж людзьмі.

Улада часам атаясамліваецца з яе прыладамі — дзяржавай, палітычнай арганізацыяй грамадства, з яе сродкамі — кіраваннем, напрыклад з яе метадамі — прымусам, неракананнем, насіллем. Некаторыя ставяць знак роўнасці паміж уладай і аўтарытэтам, які не толькі мае шмат агульнага з ёй, але і адрозніваецца ад улады прынцыпова.

Падстаў для атаясамлівання ўлады і кіравання няма. Зразумела, без кіравання немагчыма ажыццявіць уладу, але і без улады немагчыма кіраваць. Сама ўлада выступае ў выглядзе кіравання, кіраванне — у выглядзе ўлады. Але кіраванне не ёсць функцыянаванне ўлады.

Кіраванне шырэй, чым улада. Улада — элемент кіравання, крыніца сілы і кіравання. Працэс кіравання прадстаўляе сабой працэс рэалізацыі ўладнай волі для дасягнення мэты ўладара. Кіраванне — сродак, пры дапамозе якога ўздзеянне ўлады з магчымасці параўтвараецца ў рэчаіснасць.

Можна даць наступнае вызначэнне ўлады. Улада ў агульным сэнсе ёсць здольнасць і магчымасць аказваць пэўнае ўздзеянне на дзейнасць, паводзіны людзей з дапамогай якіх-небудзь сродкаў — волі, аўтарытэту, права, насілля.

З пункту гледжання тыпалогіі, выдзяляюць уладу ў бяскласавым грамадстве і класавым грамадстве.

Уладу можна разглядаць як палітычнае панаванне і як сістэму дзяржаўных органаў.

Палітычная ўлада як адна з важнейшых праяў улады характарызуецца рэальнай здольнасцю дадзенага класа, групы, індывіда праводзіць сваю волю, выражаную ў палітыцы. Палітычная ўлада ёсць спецыфічная форма грамадскіх адносін паміж вялікімі групамі людзей, рэальная здольнасць пэўнай сацыяльнай групы або індывіда праводзіць сваю палітычную волю. Асноўныя прыметы палітычнай улады:

1) наяўнасць суб'екта і аб'екта ўладных адносін;
2) загад ажыццяўляючага ўладу, які суправаджаецца рэальнай пагрозай прымянення санкцый;

3) наяўнасць механізма, які рэалізуе падпарадкаванне;

4) грамадскія нормы, якія замацоўваюць паўнамоцтвы суб'екта ўлады.

Паняцце палітычнай улады шырэй паняцця ўлады дзяржаўнай. Вядома, што палітычная дзейнасць ажыццяўляецца не толькі ў межах дзяржавы, але і ў другіх састаўных частках сацыяльна-палітычнай сістэмы: у рамках партый, прафсаюзаў, міжнародных арганізацый і г. д.

У адрозненне ад палітычнай, дзяржаўная ўлада не абавязкова выкарыстоўвае прымус для дасягнення сваіх мэт. Могуць ужывацца ідэалагічныя, эканамічныя і іншыя метады ўздзеяння. Адначасова менавіта дзяржаўная ўлада валодае манаполіяй на тое, каб заставіць членаў грамадства выконваць свае намеры.

Дзяржаўная ўлада — гэта форма палітычнай улады, якая валодае манапольным правам выдаваць законы, абавязковыя для ўсяго насельніцтва, абапіраецца на сацыяльны апарат прымусу, як па сродак выканання законаў і распараджэнняў. Дзяржаўная ўлада ў роўнай меры азначае як пэўную арганізацыю, так і практычную дзейнасць па здзяйсненню мэт і задач гэтай арганізацыі. Дзяржаўная ўлада — гэта ўлада, што здзяйсняецца спецыяльным, адасобленым апаратам кіравання (асобым апаратам людзей, якія займаюцца выключна кіраваннем дзяржаўнымі справамі).

Адносіны, якія складаюць змест дзяржаўнай улады, з'яўляюцца адносінамі палітычнымі.

Неабходна ўлічваць і наступнае: дзяржаўная ўлада ёсць спецыфічная форма палітычных адносін і служыць толькі іх часткай: дзяржаўная і палітычная ўлада з'яўляецца найбольш якаснай і вызначальнай часткай палітычных адносін, якая складае нібы іх асяродак; дзяржаўная ўлада распаўсюджваецца на ўсё грамадства ў цэлым, ахоплівае сваім уплывам асноўныя адносіны ў грамадстве; палітычная ўлада якасна характарызуецца тым, што асноўны змест яе ствараюць дзяржаўна-ўладныя загады, прымяненне якіх забяспечваецца мерамі дзяржаўнага прымусу.

Грамадскім зместам палітычнай улады ў дзяржаве з'яўляецца здольнасць арганізаванага класа праз цэнтры прымусу (эканамічнага, фізічнага, псіхалагічнага) навязаць свае ўласныя інтарэсы і волю іншым грамадскім групам, прымяняючы тактыку знаходжання кропак апоры, кампрамісаў, прымусу і пераканання. Прычым здольнасць гэта рэалізуецца праз сістэму ідэалагічных і прававых норм.

Непасрэднымі суб'ектамі палітычнай улады з'яўляюцца інстытуты і іх органы, якія кіруюць рознымі бакамі жыцця пры дапамозе розных сродкаў улады (кардынацыя, прымус, кантроль, рэпрэсіі і інш.), вызначаючы мэту і спосаб іх прымянення.

Палітыкі ў сваіх тэорыях і канцэпцыях, нават калі яны зыходзяць з розных ідэалагічных і метадалагічных пазіцый прызнаюць, што менавіта адносіны ўлады паміж вялікімі грамадскімі групамі, дзейнасць дзяржаў, барацьба за ўладу ў дзяржаве і за спосаб яе функцыянавання — гэта адметныя ўласцівасці палітычнай сферы жыцця грамадства. У той жа час прынцыповая розніца заключаецца у інтэрпрэтацыі грамадскага зместу і грамадскіх крыніц улады, інтэрпрэтацыі барацьбы за ўладу.

Канчатковымі суб'ектамі ўлады з'яўляюцца пануючыя класы. Пануючы клас — гэта сацыяльная група, якая ўвасабляе панаванне ў эканамічных адносінах, у сацыяльнай і палітычнай сферах. Менавіта воля і падтрымка групы як цэлага з'яўляецца ўмовай і крыніцай здольнасці пэўных інстытутаў да прыняцця рашэнняў, кіравання і палітычнага кіраўніцтва.

У руках пануючага класа знаходзіцца матэрыяльная сіла грамадства. Клас, які дамінуе ў эканамічнай сферы, можа не валодаць рычагамі палітычнай улады, хоць і імкнецца да іх. І насупраць, клас, які захоўвае рычагі палітычнай улады, можа апынуцца ў сітуацыі, калі яго ўплыў ў эканоміцы не з'яўляецца істотным. Гэта супярэчнасць стварае адну з важнейшых крыніц грамадскіх канфліктаў, якія складаюць рухаючую сілу гісторыі чалавецтва.

Сапраўднае панаванне пачынаецца тады, "калі клас, авалодаўшы дзяржаўным механізмам, становіцца таксама палітычна пануючым класам" (Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Т. 21. С. 171). Таму пануючы клас ў прамым сэнсе — гэта сацыяльная група, якая ўвасабляе "пануючую матэрыяльную сілу грамадства", што ўключае яе пануючыя пазіцыі не толькі ў сістэме эканамічных адносін, але і ў сацыяльнай і палітычнай сферах. У сваю чаргу "той клас, які прадстаўляе сабой пануючую матэрыяльную сілу грамадства, ёсць у той жа час і яго пануючая духоўная сіла..." (Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Т. 3. С. 45—46).

Падкрэслім, што ўлада выступае як адносіны паміж суб'ектамі, а не дадзеная аднаму з іх якасць. Адным словам, улада — гэта вось усёй палітыкі, усякага палітычнага працэсу. У адным выпадку палітыка складаецца з сутыкнення розных улад (розных цэнтраў улады) або з кампрамісу. У другім выпадку — з камандных адносін валодаючых уладай і падданых. У трэцім — з барацьбы за ўладу супраць старой улады. Варыянтаў можа быць шмат.

Улада, а тым больш палітычная ўлада не з'яўляецца "чыстай функцыяй". У яе ёсць пэўны і асобы змест. Улада набывае канкрэтнае значэнне і сэнс у ходзе гістарычнага працэсу. Суб'ектам улады можа выступаць адзін індывід, калектыў або ўсё грамадства. Ці з'яўляецца палітычная

партыя суб'ектам улады? Айчынныя і замежныя палітолагі сцвярджальнага адказу на гэтае пытанне не далі. Заходнія вучоныя не адмаўлялі існаванне партый ва ўладзе, аднак не разглядалі яе як фактар улады.

У процілегласць ім савецкія даследчыкі прытрымліваліся вядомай пазіцыі, што партыя ў СССР з'яўлялася звяном палітычнай улады, а КПСС у сваёй дзейнасці абапіралася на аўтарытэт, выхаванне, падрыхтоўку кадраў.

Улада заўсёды заснавана на прымусе.

*Уладным адносінам уласцівы наступныя прыметы:*

а) асобы апарат кіравання;

б) прымус у адносінах грамадства;

в) манаполія на рэгламентацыю палітычнага жыцця;

г) суверэнітэт органаў улады ў адносінах да іншых дзяржаў.

*Характэрныя рысы палітычнай улады:*

1. Суверэнітэт, вяршэнства, непадзельнасць. У гісторыі бываюць выпадкі двоеўладдзя, але яны заканчваюцца грамадзянскай вайной або мірным пераходам улады ў адны рукі, дыктатурай адной з улад або ахлакратыяй (уладай натоўпу).

2. Аўтарытэт, які выражаецца ў форме дырэктыў, загадаў, пастаноў, распараджэнняў, якія выконваюцца ў сілу прызнання іх выканаўцамі законнасці дадзенай палітычнай улады.

3. Валявы характар улады, што азначае наяўнасць пэўнай праграмы, мэты і гатоўнасці дабівацца іх выканання.

4. Прымус у рознай ступені, здзяйсненне якога залежыць ад канкрэтнага сацыяльна-палітычнага становішча ў той ці іншай краіне. Прычым нельга атаясамліваць прымус з дыктатурай.

Калі палітычная ўлада страчвае аўтарытэт, не можа праявіць волі і прымусу, у выніку чаго парушаецца яе суверэнітэт, у грамадстве ствараецца становішча, якое можна характарызаваць як крызіс улады або безуладдзе.

② Структуру палітычнай улады можна прадставіць у выглядзе своеасаблівай піраміды, іерархічны верх якой валодае паўнамоцтвамі кіраваць людзьмі, прымаць законы, выкарыстоўваць пэўную сістэму прымусу да іх выканання.

Наяўнасць улады дае магчымасць яе носьбіту вызначаць грамадска значныя мэты, вырашаць сацыяльныя канфлікты, прымаць рашэнні. Да асноўных функцый палітычнай улады адносяцца: 1) панаванне; 2) кіраўніцтва; 3) кіраванне; 4) арганізацыя, 5) кантроль.

*Панаванне* — гэта механізм ажыццяўлення ўлады, які прымае форму сацыяльных інстытутаў і мяркуе расчляненне сацыяльных груп на пануючыя і падпарадкаваныя, іерархію і сацыяльную дыстанцыю паміж імі, выдзяленне і адасабленне апарату кіравання.

Розніцу паміж панаваннем і ўладай праводзіць нямецкі вучоны М. Вэбер. На яго думку, традыцыйнае панаванне азначае верагоднасць таго, што загады павінны сустрэць паслушэнства ў пэўнай часткі людзей.

Легітымнасць (законнасць) панавання засноўваецца на праве і правасвядомасці. Яно звязана з падзяленнем улад, з вычляненнем асобага адміністрацыйнага апарату, які забяспечвае выкананне прадпісанняў і загадаў.

*Кіраўніцтва* — гэта здольнасць партыі, класа, групы ажыццяўляць сваю палітычную лінію шляхам уздзеяння розных метадаў і форм на кіруемыя сферы, аб'екты, калектывы, асобных людзей. Напрыклад, палітычныя партыі выпрацоўваюць праграмы, якія прапануюцца грамадзянам краіны, а ў выпадку атрымання ад іх мандата на ўладу вылучаюць на ключавыя пасады ў сферы кіравання сваіх прадстаўнікоў.

*Кіраванне* — гэта выкарыстанне паўнамоцтваў улады на фарміраванне мэтанакіраваных паводзін аб'ектаў кіравання. Кіраванне павінна забяспечваць аптымальнае ўздзеянне на аб'екты (працоўныя калектывы, класы, нацыі, насельніцтва раёна і г. д.). Канкрэтнай кіраўнічай дзейнасцю заняты звычайна адміністрацыйны апарат пануючага класа або правячай (пануючай) партыі.

*Арганізацыя* — узгадненне, упарадкаванне, забеспячэнне ўзаемасувязі дзеянняў асобных людзей, груп, класаў. Калі кіраванне і кіраўніцтва здзяйсняюцца па вертыкальнай плоскасці (ад кіраўнікоў і работнікаў апарату кіравання да падначаленых), то арганізацыя — па гарызантальнай.

Задачай кантролю з'яўляецца забеспячэнне выканання сацыяльных норм, правіл дзейнасці людзей і сацыяльных груп у грамадстве. Кантроль таксама выконвае функцыю адваротнай сувязі, з дапамогай якой улада сочыць за вынікамі яе кіраўнічага ўздзеяння.

Адным з першачарговых пытанняў далейшага ўдасканалення структуры ўлады ў Рэспубліцы Беларусь і іншых дзяржавах, узнікшых пасля распаду СССР, паўстала праблема раздзялення ўлад.

Сістэма раздзялення ўлады ў той ці іншай ступені ўласціва арганізацыі ўлады ў грамадстве. Як свайго роду кампраміс паміж рознымі сацыяльнымі слаямі яна садзейнічае ўстойлівасці грамадства, выкрывае крайнія праявы ўладных адносін. Разам з тым гэта сістэма абмяжоўвае ўдзел народа ў кіраванні дзяржавай. Умовамі раздзялення ўлады з'яўляюцца:

1) аддзяленне палітыкі ад эканомікі;

2) палітычны плюралізм у грамадстве.

Практычная рэалізацыя раздзялення ўлады мяркуе выкананне патрабаванняў:

а) юрыдычнага раздзялення заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады, іх адноснай незалежнасці адна ад другой;

б) шматпартыйнасці і парламенцкай дэмакратыі;

в) спалучэння прэзідэнцкай і парламенцкай улады;

г) першынства закону ў дзяржаве і грамадстве;

д) раздзялення выбараў у розныя органы ўлады (па часе, па структуры);

е) паяўнасці інстытута адстаўкі;

ж) дэмакратыі як рэальнай магчымасці кожнага члена грамадства ўздзейнічаць на палітычныя працэсы (у асноўным праз механізм выбараў);

з) адсутнасці манаполіі на ідэалогію, другаснасці ідэалогіі ў адносінах да права, закону. У якасці прыкладу разгледзім сістэму раздзялення ўлад у ЗША. Па Канстытуцыі краіны заканадаўчая ўлада належыць Кангрэсу, які складаецца з Палаты прадстаўнікоў і Сената. Выканаўчай уладай надзелены Прэзідэнт ЗША. Выбіраецца ён не Кангрэсам і насельніцтвам, а выбаршчыкамі. Прзідэнт ЗША з'яўляецца кіраўніком дзяржавы і ўрада. Ён не падпарадкаваны Кангрэсу. Аднак Палата прадстаўнікоў можа ўзбудзіць абвінавачванне (імпічмент) супраць Прэзідэнта ў выпадку ўчынення ім правапарушэнняў. Але рашэнне аб прыцягненні Прэзідэнта да адказнасці прымае Сенат.

У свой час правячы клас ЗША вырашыў прынесці ў ахвяру асабіста Ніксана, прэстыж прэзідэнцкай улады, каб выратаваць прэстыж амерыканскай палітычнай сістэмы ў цэлым.

Кангрэс зацвярджае дзяржаўны бюджэт па прадстаўленні Прэзідэнта. Прэзідэнт прызначае міністраў, але са згоды Сената.

Законы, якія прымае Кангрэс, падпісвае Прэзідэнт. Ён можа вяртаць іх (накласці вета). Кангрэс можа пераадолець вета, адобрыўшы закон другі раз (2/3 галасоў у кожнай з палат).

Вярхоўны суд ЗША складаецца са старшыні і членаў суда, якіх пажыццёва прызначае Прэзідэнт са згоды Сената. Суд з'яўляецца органам канстытуцыйнага нагляду.

Аб'яднанне ўлад недапушчальна. Так аб'яднанне заканадаўчай і выканаўчай улад падрывае вяршэнства закону.

У былым СССР склалася такая сістэма, што ў адрозненне ад іншых дзяржаў у ім аказалася цяжка выдзеліць не толькі кампаненты заканадаў-

чай, выканаўчай і судовай улады, але і самі гэтыя галіны ўлады былі сцягнуты ў адзін вузел. Найвялікшая канцэнтрацыя ўлады прыходзілася на выканаўчую. Заканадаўчая практычна ніякай улады на мела. Выканаўча-кіраўнічы апарат дапускаў бюракратычныя скажэнні законаў, выдаваліся супрацьпраўныя падзаконныя акты. З-за вялікай залежнасці судоў ад "тэлефоннага права" і невысокай якасці іх работы судовая ўлада не была аўтарытэтнай. А без наяўнасці аўтарытэту якая гэта ўлада?

Акрамя таго, структура ўлады ў СССР мела і тую асаблівасць, што ўсе ніці дзяржаўнай улады сцягваліся да апарата партыі.

Падмена дзяржаўнага заканадаўства партыйным кіраўніцтвам карэнным чынам дэфармавала ўсю прававую сістэму. Асноўнае месца ў яе заканадаўчых актах замест закону занялі сумесныя пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР. Гэта прывяло да "размывання" нарматыўнасці прымаемых актаў, падмены выразных заканадаўчых формул дэкларацыямі, заклікамі, лозунгамі, парадзіла прававы нігілізм.

Такая структура з часам стала неэфектыўнай і патрабавала перабудовы. Але рэформа палітычнай сістэмы ў СССР не дала чакаемых вынікаў.

Сумны вопыт аб'яднання ўсіх галін улады ў былым СССР вучыць не забываць аб ператварэнні ў жыццё асноўных функцый палітычнай улады.

Функцыі палітычнай улады абазначаны яе вызначэннем. Сюды ўваходзяць:

1. Фарміраванне палітычнай сістэмы грамадства.

2. Арганізацыя яго палітычнага жыцця, палітычных адносін.

3. Кіраўніцтва органамі ўлады і палітычнымі, а таксама непалітычнымі працэсамі.

4. Кантроль палітычных і іншых адносін і, урэшце рэшт, — стварэнне пэўнага, характэрнага для таго ці іншага грамадства тыпу праўлення, палітычнага рэжыму і дзяржаўнага ладу. Палітычная ўлада павінна:

а) забяспечваць законныя правы грамадзян, іх канстытуцыйныя свабоды заўсёды і ва ўсім;

б) сцвярджаць права як стрыжань грамадскіх адносін і самой умець падпарадкавацца праву;

в) выконваць гаспадарча-стваральныя функцыі.

Універсальнымі якасцямі ўлады з'яўляюцца ўсеагульнасць (функцыянаванне ва ўсіх сферах грамадскіх адносін і палітычных працэсах), здольнасць пранізваць усе віды дзейнасці, звязваць людзей, грамадскія групы і супрацьпастаўляць іх.

Галоўная задача палітычнай улады — служыць арганізацыйным і рэгулятыўна-кантрольным срокам або спосабам існавання палітыкі

Агульныя арганізацыйныя, рэгулятыўныя і кантрольныя функцыі ўлады канкрэтызуюцца ў палітыцы ў мностве відаў палітычнай дзейнасці: а) кіраванні; б) прыняцці рашэнняў; в) выбары мэт; г) вызначэнні задач выканаўцаў, іх падборы; д) арыентацыі ў палітычных і непалітычных сітуацыях; е) стварэнні ўласнай структурнай арганізацыі.

Уладу можна прадставіць як сістэму функцый:

1) мадэліравання ўласнай дзейнасці;

2) аналізу палітычнага і грамадскага становішча і канкрэтных сітуацый;

3) вызначэння сваёй стратэгіі і прыватных тактычных задач;

4) нагляду і пакарання (рэпрэсіўная функцыя) паводзін, якія адхіляюцца ад норм права;

5) прысваення і размеркавання неабходных рэсурсаў (матэрыяльных і духоўна-валявых, інтэлектуальных, салідарнасці і падтрымкі прыхільнікаў і г. д.);

6) размеркавання рэсурсаў палітыкі — мер даверу, нагаднення́ў, абмену ўступкамі і перавагамі, узнагародамі і г. д.;

7) пераўтварэння палітычнага і грамадскага (сацыяльнага, эканамічнага, прававога, культурнага, маральнага) акружэння ўлады ў інтарэсах яе палітыкі.

Палітычная ўлада існуе і функцыянуе не толькі ў розных сферах грамадства, але і на трох узроўнях яго сацыяльнай структуры:

а) грамадскім, які ахоплівае найбольш складаныя сацыяльныя і палітычныя адносіны;

б) публічным або асацыятыўным, які аб'ядноўвае калектывы і адносіны ў іх (грамадскія арганізацыі, саюзы, вытворчыя і іншыя калектывы).

в) асабістым (прыватным), у малых групах і г. д.

Палітолагі вывучаюць уладу на нацыянальных, рэгіянальных і мясцовых узроўнях. Яны разглядаюць функцыянаванне гэтых інстытутаў і ацэньваюць тую ступень, у якой улада раздзелена, тыя спосабы, з дапамогай якіх прымаюцца рашэнні, і тую форму, у якой фармальныя інстытуты ўзаемадзейнічаюць з палітычнымі партыямі і іншымі ўрадамі.

Адной з праяў палітычнай улады з'яўляецца ценявая ўлада. Яна адрозніваецца адсутнасцю публічнага характару дзеянняў суб'екта ўлады па фарміраванню і здзяйсненню сваёй аўтарытарнай волі. Адрозненні ценявой (крыптакіравання) і яўнай (эмерджментнай) улад могуць прысутнічаць на ўсіх узроўнях палітычнай сістэмы.

③ Патрабаванне легітымнасці ўлады ўзнікла як рэакцыя супраць гвалтоўнай змены ўлады і гвалтоўнай перакройкі дзяржаўных меж. Але

патрэба ў легітымнасці фарміравалася задоўга да французскіх рэвалюцый, у эпоху манархій, саслоўяў. Яна выражала ўсведамленне неразважнасці агульнапрынятага парадку над захопам улады сілай, заваяваннем, самавольствам, нарушэннем агульнапрызнаных норм.

У нашы дні легітымнасць — абавязковы прызнак цывілізаванай улады, прызнання грамадзянскай супольнасцю і сусветнай садружнасцю яе правамернасці. Легітымная ўлада заснавана на прызнанні права носьбітаў улады прадпісваць нормы паводзін іншым індывідам.

Тэрмін "легітымнасць, легітымізм" узнік у пачатку XIX ст. і выражаў імкненне аднавіць у Францыі ўладу караля як адзіназаконную, у адрозненне ад улады ўзурпатара. Тады ж легітымізм набыў і іншы сэнс — прызнанне дадзенай дзяржаўнай улады і пэўнай тэрыторыі дзяржавы на міжнародным узроўні.

Легітымізацыя (ад лат. *legitimus* — законны) — працэдура грамадскага прызнання якога-небудзь дзеяння, дзеючай асобы, падзеі або факта. Яна сцвярджае палітыку і ўладу, тлумачыць і апраўдвае палітычныя рашэнні, стварэнне палітычных структур, іх змену, аднаўленне і г. д. Легітымнасць прызвана забяспечыць паслушэнства (згоду, палітычны ўдзел без прымусу), а калі яно не дасягаецца — апраўданне такога прымусу, выкарыстанне сілы і ўсіх другіх сродкаў, якімі валодае ўлада. Легітымізацыя прызвана выклікаць прыхільнасць да даверу, легітымная ўлада і палітыка аўтарытэтныя і эфектыўныя.

Легітымнасць улады — тэрмін, які быў уведзены Вэберам і абазначаў правамерную пэўнасць, адпаведнасць сацыяльнага парадку і палітычнай дзейнасці законам дзяржавы ў адрозненне ад узурпацыі, захопу ўлады, звычаю і г. д. Легітымнасць прыдае сістэме палітычных адносін устойлівасць і стабільнасць, паколькі прававое абгрунтаванне тут дапаўняе веру, мараль, а суб'екты ўлады надзелены паўнамоцтвамі ад імя грамадства, падкантрольныя яму. Тым самым забяспечваецца цэласнасць грамадства, адзінства аб'ектаў і суб'ектаў палітыкі і ўладных адносін.

"Прызнанне ўлады падначаленымі", — указвае Вэбер, — ёсць перадумова легітымнасці і яе аснова". У такім выпадку ўлада атрымлівае магчымасць дыктаваць абавязковыя патрабаванні і ўстанаўліваць прыклады паводзін. У сучасных умовах важнейшым сродкам забеспячэння легітымнасці ўлады з'яўляюцца ўсеагульныя парламенцкія выбары і выбары прэзідэнтаў у прэзідэнцкіх рэспубліках.

У заходняй паліталогіі шырока вывучаецца роля ўлады ў канфліктных сітуацыях — у міжнародных адносінах, у грамадстве ў цэлым і на асобным прадпрыемстве.

Асобая і надзвычайна важная роля вышэйшага арбітра паміж заканадаўчай і выканаўчай уладай, уладай і грамадствам адводзіцца Канстытуцыйнаму суду. Ён прызваны вызначаць адносіны ўсіх інстанцый улады, грамадства і яго членаў да права, закону і яго цэнтральнага звяна — канстытуцыі. Адносіны паміж раздзеленымі ўладамі рэгулююцца адпаведнымі законамі, палажэннямі канстытуцыі (калі яны сфармуляваны ў ёй і дзейнічае сама канстытуцыйная форма праўлення), традыцыямі палітычнай культуры грамадства, але нярэдка складваюцца зусім не гарманічна. Лік і формы ўлад, якія ўзаемадзейнічаюць і канкурыруюць, не абмяжоўваюцца класічнай трыядай, структура гэта адчынена для новых відаў улады. Дэмакратызацыя ўлады і яе раздзяленне звязаны з дзеяннем яе сацыяльнага кантролю, крытыкі і падтрымкі ўлады грамадствам, якое атрымала для гэтага спецыяльны інструмент — прэсу, які ў XX ст. развіўся ў так званыя сродкі масавай інфармацыі — "чацвёртую ўладу", якая рэальна дзейнічала ва ўмовах свабоды слова.

Легітымізацыя спалучаецца з процілеглым ёй працэсам — дэлегітымізацыяй — стратай даверу, пазбаўленнем палітыкі і ўлады грамадскага крэдыту. Расчараванне ў ідэалах, канцэпцыях палітыкі, у яе мэтах і метадах, людзях, якія яе прадстаўляюць, — адзін з аспектаў палітычнага жыцця грамадства, такая ж рухаючая сіла развіцця палітыкі, як і сама легітымізацыя. Спробы папярэдзіць дэлегітымізацыю ўлады магчымы. Калі ўлада выяўляе ўменне лічыцца з запытамі свайго палітычнага і сацыяльнага акружэння, легітымізацыя аднаўляецца. Двайны дэмакратычны механізм легітымізацыі — дэлегітымізацыі забяспечвае сапраўды эфектыўны дынамічны палітычны працэс.

Легітымная ўлада заснавана на прызнанні права носьбітаў улады прадпісваць нормы паводзін іншым індывідам. Але легітымнасць зусім не азначае, што абсалютна ўсе грамадзяне прымаюць дадзеную ўладу. Легітымнасць не азначае таксама падтрымкі ўсімі праводзімага палітычнага курсу. У грамадстве заўсёды ёсць крытыкі правячай групы, нязгодная меншасць. Легітымнасць азначае, што прынятыя законы і ўказы выконваюцца асноўнай часткай грамадства. Такое магчыма пры згодзе з дадзенай уладай і пры развітой культуры законапаслушэнства.

Легітымнасць — сацыякультурная характарыстыка ўлады. Яна можа ацэньвацца, нават вымярацца, але не паддаецца поўнай фармалізацыі. Асаблівасць легітымнасці заключаецца ў тым, што яна з'яўляецца вынікам эвалюцыі грамадства. Таму адназначную ацэнку легітымнасці можна даць толькі ў грамадстве з устойлівымі нормамі паводзін.

Што трэба лічыць першасным крытэрыем легітымнасці? Па гэтаму

пытанню маецца два пункты погляду. Згодна ліберальна-дэмакратычнай пазіцыі легітымнай трэба прызнаваць толькі такую ўладу, якая сфарміравана ў выніку дэмакратычных працэдур. Улада, якая ўстаноўлена ў выніку насілля, не прызнаецца законнай. Згодна прагматычнай пазіцыі галоўнае не толькі ў выбарнасці ўлады, але і ў яе здольнасці авалодаць складанай сітуацыяй у грамадстве, падтрымліваць у грамадстве стабільнасць.

Сёння пераважае пункт погляду, што асновай легітымнасці з'яўляецца перакананне ў правамернасці дадзенага ладу.

Гістарычна першым тыпам легітымнасці ўлады была ўлада, якая заснавана на праве наследавання прастола. Такая легітымнасць адпавядала нормам традыцыйнага грамадства. Апора ў асноўным на традыцыю вызначае абмежаванасць царскай улады. З пераходам да індустрыяльнага грамадства традыцыйны тып панавання падмяняецца або падмацоўваецца спецыяльнымі інстытутамі, апаратам, бюракратыяй.

У грамадстве, якое перажывае бурныя стадыі мадэрнізацыі, але не засвоіла дэмакратычныя тыпы кіравання, распаўсюджаны харызматычны тып уладарання. Думку аб гэтым тыпе легітымнасці ўпершыню выказаў Вэбер. На яго погляд, асаблівасць харызматычнага тыпу ўладарання заключаецца ў тым, што лідэр валодае максімальнай легітымнасцю.

Разнавіднасцю харызматычнага тыпу легітымнасці з'яўляецца правадырскі — плебісцытарная легітымнасць, якая характэрна для аўтарытарных і таталітарных рэжымаў. У іх аснове ляжыць апора на ўладу лідэра, партыі, арміі.

У канстытуцыйным грамадстве развіты ліберальна-дэмакратычны або канстытуцыяналісцкі тып легітымнасці, які заснаваны на свабодным волевыяўленні грамадзян, выбарнасці ўсіх цэнтральных органаў улады народам, канстытуцыйнай абмежаванасці сферы дзейнасці дзяржавы, раўнапраўі ўсіх палітычных сіл, якія дзейнічаюць у рамках закону .

Вэбер класіфікуе легітымнасць па трох відах:

1) традыцыйны, г. зн. заснаваны па няпісаных законах традыцый, звычаяў, культуры, дзяржаўных палітычных адносінах;

2) харызматычны, эмацыянальна-валявы;

3) рацыянальны, заснаваны па прынятых у дзяржаве парадках і законах, разумных меркаваннях.

Легітымізацыю асобага тыпу стварае прававая аргументацыя. Апеляцыя да закону, г. зн. легальнасці ўлады або палітыкі, іх законнасць сама па сабе можа не быць легітымнай у вачах грамадства або яго часткі. Як і ў іншых тыпах легітымізацыі, у прававой легітымізацыі, нягледзячы на фармальную рацыянальнасць, таксама існуе прыметы і рацыянальны мо-

мапт. Закон можа легалізаваць уладу асобы, якую грамадства не прымае, але якой вымушаны падпарадкавацца.

Урадавы акт можа узаконіць палітычныя санкцыі, прававыя або эканамічныя меры, што краіна не адабрае, але вымушана цярпець і г. д. Такім чынам легітымізацыя, як і легалізацыя, можа быць пры пэўных умовах фармальнай або несапраўднай. Ва ўсякім выпадку, грамадства можа раздзяляцца ў адносінах легітымнасці якога-небудзь палітычнага ўплыву, якой бы рацыянальнай ні была яе аргументацыя.

Такім чынам, падводзячы вынік разгляду праблем палітычнай улады, можна зрабіць наступныя вывады. Палітычная ўлада — гэта рэальная здольнасць дадзенага класа, групы, індывіда праводзіць сваю волю ў палітыцы і прававых нормах. Палітычная ўлада з'яўляецца стрыжнем, галоўным звяном, які звязвае ўсе элементы палітычнай сістэмы, мэтай палітычнай барацьбы. Яна пранізвае ўсе палітычныя працэсы, з'яўляецца важным кампанентам палітычных дзеянняў. Моцная і аўтарытэтная палітычная ўлада не процістаўляе сябе грамадству, а максімальна актывізуе яго магчымасці. Двайны дэмакратычны механізм легітымізацыі-дэлегітымізацыі забяспечвае сапраўды эфектыўны, дынамічны палітычны працэс.

## 2.3. Эліта ў палітыцы

У любой палітычнай сістэме, нават в развітымі дэмакратычнымі інстытутамі, ажыццяўленне ўлады ўяўляе сабой функцыю, у выкананні якой большасць насельніцтва не прымае удзел. Гэтым заняты асобы слой людзей, які атрымаў у паліталогіі назву "эліта". Вывучаючы месца і ролю эліты ў палітычным жыцці грамадства, важна звярнуць увагу на наступныя асноўныя пытанні.

1. **Паняцце эліты, прычыны яе ўзнікнення і існавання.**
2. **Тыпалогія і структура эліты.**
3. **Асноўныя шляхі фарміравання эліты і яе ўплыў ў палітыцы.**

① Тэрмін "эліта" (лац. *eligere* і франц. *elite* — лепшы, адборны, выбраны), пачынаючы з XVII ст. ужываўся для абазначэння тавараў вышэйшай якасці, а пазней стаў выкарыстоўвацца ў генетыцы, а таксама ў сельскай гаспадарцы для абазначэння насення лепшых гатункаў.

У XVIII—пачатку XIX ст. элітай сталі называць "выбраных людзей" перш за ўсе знакамітых. Напрыклад, у Оксфардскім слоўніку, выдадзеным у Англіі ў 1823 г., элітай былі названы вышэйшыя сацыяльныя групы грамадства, заснаванага на іерархічнасці.

У палітычнай навуцы тэрмін "эліта" стаў шырока ўжывацца толькі ў